# 2024 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2024 год з’яўляецца юбілейным.*

# 60 гадоў

**Шамякін, І. П. Сэрца на далоні : Раман / І. П. Шамякін – Мінск : Беларусь, 1964. – 444 с.**




Раман Івана Шамякіна (1921–2004) «Сэрца на далоні» ў свой час стаў адным з самых чытаемых твораў беларускай літаратуры. Напісаны быў у перыяд з 1960 па 1963 год і першапачаткова надрукаваны ў часопісе «Полымя». У 1964 годзе з’явілася першае асобнае выданне рамана тыражом у 12 000 экзэмпляраў.



# «Сэрца на далоні» : 60 гадоў

Выданне рамана 1964 года змяшчае 16 чорна-белых палосных ілюстрацый, на якіх праз візуалізацыю герояў перададзена эмацыянальная атмасфера твора. Аўтарам ілюстрацый з’яўляецца вядомы мастак-графік Арлен Кашкурэвіч (1929–2013).















# «Сэрца на далоні» : 60 гадоў

Падзеі ў рамане «Сэрца на далоні» разгортваюцца адносна цэнтральнай сюжэтнай лініі «журналіст Кірыл Шыковіч і старшыня гарсавета Сямён Гукан». Яны калісьці разам напісалі кнігу пра падполле. Цяпер жа Шыковіч імкнецца перапрацаваць напісанае, таму што не ўсё ў кнізе праўда. Яго хвалюе справа доктара Савіча, запісанага ў здраднікі, а на самай справе – удзельніка падполля.

Кляймо дачкі здрадніка ўсё жыццё нясе і Зося Савіч. Падчас вайны яна выратавала Антона Яраша ад смерці, схаваўшы яго ў доме, трапіла ў фашысцкі палон, а потым па ілжывым даносе Гукана была выслана ў Сібір. Тым не менш Зося захавала чалавечнасць, дабрыню і веру ў людзей. Праз шмат год ганенняў, лагераў, дачка «ворага народа» апынулася ў бальніцы Антона Яраша з захворваннем сэрца. Ёй патрэбна аперацыя. Для Яраша — гэта шанец аддзячыць дзяўчыне, якая калісьці выратавала яго.

Шыковіч разам з Ярашам, з якім ён сябруе, дабіваюцца магчымасці сказаць праўду пра Савіча і рэабілітаваць яго імя і імя яго дачкі. Яны ўступаюць у барацьбу з Гуканам. Тое ці іншае дачыненне да гэтай барацьбы маюць усе героі рамана.

# «Сэрца на далоні» : 60 гадоў

Як сведчыць Т. І. Шамякіна, дачка пісьменніка, у вобразе журналіста Шыковіча ўвасоблены рысы самога аўтара, а ў вобразе доктара Яраша – рысы драматурга Андрэя Макаёнка, шчырага сябра Івана Шамякіна.

Правобразам доктара Савіча ў рамане «Сэрца на далоні» быў Яўген Клумаў, беларускі акушэр-гінеколаг, Герой Савецкага Саюза (1965), кандыдат медыцынскіх навук, прафесар, удзельнік Мінскага падолля. Загінуў раніцай 13 лютага 1944 года ў аўтамабілі-душагубцы на шляху з канцлагера на мінскай вуліцы Шырокай у Малы Трасцянец.

# «Сэрца на далоні» : 60 гадоў

Раман «Сэрца на далоні» неаднойчы перавыдаваўся асобнай кнігай:
1969 г. – другое выданне тыражом 36000 экзэмпляраў у выдавецтве «Беларусь»;
1996 г. — выданне тыражом 15000 экзэмпляраў у выдавецтве «Юнацтва»;
2001 г. — выданне тыражом 4200 экзэмпляраў у выдавецтве «Мастацкая літаратура»;
2007 г. — выданне тыражом 4000 экзэмпляраў у выдавецтве «Мастацкая літаратура»;
2008 г. — выданне тыражом 3000 экзэмпляраў у выдавецтве «Мастацкая літаратура»;
2021 г. — выданне тыражом 1500 экзэмпляраў у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Выданні перакладаў рамана :
1965 г. — выданне на рускай мове тыражом 200000 экзэмпляраў у выдавецтве «Беларусь», Мінск;
1968 г. — выданне на польскай мове тыражом 5260 экзэмпляраў у выдавецтве «Książka i Wiedza», Варшава;
1970 г. — выданне на армянскай мове тыражом 10000 экзэмпляраў у выдавецтве «Айастан», Ерэван;
1970 г. — выданне на малдаўскай мове тыражом 10000 экзэмпляраў у выдавецтве «Картя Молдовеняскэ», Кішынёў;
1971 г. — выданне на таджыкскай мове тыражом 7000 экзэмпляраў у выдавецтве «Нашриёти"Ирфон"», Душанбэ.
І інш.

# «Сэрца на далоні» : 60 гадоў

●У 1967 годзе за раман «Сэрца на далоні» і пенталогію «Трывожнае шчасце» Іван Шамякін атрымаў літаратурную прэмію імя Якуба Коласа.

● Прачытаць творы Івана Шамякіна, у тым ліку і раман «Сэрца на далоні», можна на сайце па спасылцы: https://shamiakin.ru/

● У 1964 годзе на Беларускім тэлебачанні па матывах рамана «Сэрца на далоні» рэжысёрам Віктарам Карпілавым зняты аднайменны фільм.

● У 1966 годзе на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра Якуба Коласа рэжысёрам Аляксандрам Падабедам пастаўлены спектакль «Сэрца на далоні».

● Раман «Сэрца на далоні» агучаны і ў выглядзе аўдыякніг размешчаны на канале YouTube:
https://www.youtube.com/playlist?list=PLFOasMnqCCd4weTgFh53hX6jsOeVTKWtC ;

https://www.youtube.com/watch?v=IuLcgZ3FHuY